**Півавар М.В.**

# АГЛЯД КРЫНІЦ ПА ГІСТОРЫІ ПАСЁЛКА ЛУЖАСНА ВІЦЕБСКАГА РАЁНА

Вывучэнне гісторыі населеных месцаў мае надзвычай важнае значэнне. Як у кроплі вады адлюстроўваецца ўвесь свет, так, у гісторыі невялікага населенага месца адбываюцца падзеі айчыннай і нават сусветнай гісторыі. І, як правіла, падзеі маюць мясцовыя асаблівасці. З гісторыі месцаў складаецца гісторыя краіны і таму знікненне любой вёскі ці пасёлка вядуць да страты часткі агульнанацыянальнай гісторыі і культуры. Мэтамі артыкула з'яўляецца публікацыя вызначаных пісьмовых гістарычных крыніц пры выкарыстанні якіх магчыма напісанне гісторыі паселішча, а таксама паказаць значнасць падобных матэрыялаў пры вывучэнні гісторыі свайго краю. У дадзенай працы разглядаюцца пісьмовыя гістарычныя крыніцы, якія найбольш даступны для рэгіянальных даследчыкаў і захоўваюцца ў Віцебскай абласной бібліятэцы. Не кранаючы зборнікі дакументаў, акцэнтуем сваю ўвагу на кнігах і зборніках матэрыялаў XIX – першай паловы XX ст. як найбольш даступных.

Важнейшай крыніцай па гісторыі вёсак з'яўляюцца "Памятные книжки Витебской губернии". Памятныя кніжкі – афіцыйныя ўрадавыя выданні, у якія ўключаліся звесткі храналагічнага характару: табель-календары, адрас-календары з пералікам губернскіх і павятовых урадавых, грамадзянскіх і рэлігійных устаноў і іх супрацоўнікаў, месяцасловы, юбілейныя указальнікі); адміністрацыйныя (тэрытарыяльна-адміністрацыйны падзел губерні, паветаў, пошта, тэлеграф); даведачныя: шляхі зносін з указаннем адлегласці між паштовымі станцыямі, кірмашы, інфармацыя пра фабрыкі і заводы, навучальныя ўстановы (народныя школы граматы, царкоўна-прыходскія школы, гімназіі, лютэранскія, яўрэйскія навучальныя ўстановы), прыходы, храмы, прычт, медыцынскія ўстановы, кніжныя крамы, бібліятэкі, друкарні, клубы, дабрачынныя таварыствы; статыстычныя: аб землеўладанні і землеўласніках, звесткі па сельскай гаспадарцы, дэмаграфіі, гандлі, вытворчасці мануфактур і прадпрыемстваў. У неафіцыйным раздзеле друкаваліся артыкула па мясцовай гісторыі, этнаграфіі і фальклоры, эканоміцы, прыродазнаўстве, архіўныя матэрыялы.

Пачнем з духоўнага жыцця. У статыстычнай частцы, раздзеле прысвечаным прыходам і храмам змяшчаецца інфармацыя пра Лужаснянскую Свята-Узвіжанскую царкву. Інфармацыя вельмі скупая, але дазваляе ўявіць пра тое, што быў святаром (Иосиф Томашевский), яго узрост (1826 г.), адукацыю (Окончил Полоцкую духовную семинарию), сямейны (Женат, имеет 2 сына и 2 дочери) і матэрыяльны стан (Оклад 140 руб.) [1].

Не усе запісы настолькі інфарматыўныя. У некаторых кніжках падаецца толькі назва царквы і прозвішча святара: Лужеснянская Св. Воздвиженская церковь настоятель Іосиф Томашевский [2]. Аналіз усіх кніжак дазваляе прасачыць гісторыю храма, змены ў службе святароў. Напрыклад, з кніжкі за 1885 г. даведваемся, што да Свята-Узвіжанскага храма ў Лужасна была прыпісана Траецкая царква ў в. Шалыгіна. Святаром служыў Георгий Іоан. Ліоренцевич. У 1908 г. адбылося асвяшчэнне пабудаванай Пакроўскай царквы [3]. У 1909 г. у Лужаснянскім прыходзе новы святар – *Петр Иоанович Жгун*. Ён жа і загадчык царкоўна-прыходскай школы і законавучыцель.

Зусім невялікія, але каштоўныя звесткі пра ўстановы адукацыі таксама можна знайсці ў памятных кніжках.

У раздзеле "Ведомость об учебных заведениях по Витебской губернии за 1864–65 г". ***Лужеснянское*** – принадлежало министерству народного просвещения, мужское, училось 7 учеников / в других от 7 до 14/, учитель 1 – мужского пола [4]. У 1908 г. мелася тая ж царкоўна-прыходская школа. Загадчыкам і законавучыцелем быў *Георгий Лиоренцевич*, настаўнікам *Петр Иоакимович Богданович*.



Репозиторий ВГУ

У 1909 г. у Лужасна было ўтворана ***сельскохозяйственное училище***. Управляючым з'яўляўся Казимир Адам. Михайлович змяшчаецца інфармацыя пра адукацыю і службу (ок. средн. учебн. заведение сл. 12 авг. 1890 г.) і калі прыступіў да выканання абавязкаў (дол. 15 ноября 1909 г.). такая ж інфармацыя падаецца пра выкладчыка рамяства (нч. Федор Владм. Кондратьев прв. ок. Горецк. рем. училище сл и долж. 8 янв. 1910 г.) [5].

З кніжцы за 1908 г. можна даведацца пра тое, што ў Лужасна пачаў дзейнічаць "***Лужеснянский земледельческий кружок*** [(Адр.: г. Витебск) Председатель дсс (действительный статский советник) Вал. Корнил. Златковский, вице-председатель Герон. Франц. Самович, секрет.-казначей двор. Евг. Каз. Стукалич. Члены правления: мещ. Ив. Алексеевич Азеуш, дв. Александр Конст. Сушинский, кр. Григ. Іосиф. Мищенко]" [6]. З такіх дэталяў цікава даведацца, што сакратаром-казначэем школы быў брат вядомага віцебскага юрыста, краязнаўцы Уладзіміра Казіміравіча Стукаліча. А брат Івана Аляксеевіча Азеўша Пётр быў растраляны немцамі ў 1942 г. за дапамогу, аказаную чырвонаармейцам у лютым 1942 г. [7]. Па кніжцы за 1912 г. можна прасачыць пэўныя змены, якія адбыліся ў складзе гуртка. Старшынёй стаў [н.с. (надворный советник) К.А. Михайловский, вице-пред. – Мод. Михл. Бартыневич, секретарь – Михаил Ильич Пичугин]. Яшчэ адна навіна – у Лужасна з'явілася Вольно-пожарная дружина, старшынём якой:з'яўляўся Казімір Міхайлоўскі

У кніжках можна адшукаць цікавы матэрыял пра эканамічнае развіццё вёскі. Каштоўнейшай крыніцай для далейшых росшукаў інфармацыі пра вёску з'яўляецца "Алфавитный поуездный список землевладельцев Витебской губернии" [8]. У спісе "землевладельцев Витебского уезда и их владений", сярод іншых: "... Краснодемская Екатерина римско-католического вероисповедания - ***Лужесно*** и Шалыги 2234 десятины. У радзеле "Винокуренные заводы и фабрики" можна знайсці звесткі пра тое, што ў маёнтку Лужасна памешчыцы Кацярыны Краснодембскай у 1859 г. быў заснаваны вінакураны завод. Рабочых і майстроў 6 [у іншых заводах працавала да 10 рабочых]. Выраблена прадукцыі на суму *акц. 60 рублей* [у іншых ад 30 до 10000 рублёў] [9]. У 1865 г. у маёнтку [***Лужесное*** помещицы Краснодембской] меўся вадзяны млын: [число камней или поставов – 8. Количество вымалываемой муки 27,000 пудов] [10].

Пры Лужаснянскім пагосце 14 верасня, у храмавае святы – дзень Узвіжання Крыжа Гасподняга праводзіўся кірмаш. "…Главный предмет торга составляют, как почти на всех кирмашах напитки, деревенские лакомства, фрукты, кроме того иногда железные сельскохозяйственные изделия: серпы, косы и прочая; тут же являются порой знаменитые офени со своими коробками. В общей сложности каждый из сих кирмашей привозом товаров не более как до 100 рублей, а продажей не более как 74 рублей, а на всех 1700 привезено 1200 продано. [для параўнання – у Віцебскім павеце на 1867 год праводзілася 14 кірмашоў] [11].

Да статыстычных крыніц, у якіх можна знайсці цікавыя звесткі па гісторыі вёскі аднясем "Обзоры Витебской губернии". Як эканамічнага, так і сацыяльна-культурнага характару. Напрыклад, у кнізе за 1896 год паведамляецца, што "...16 ноября в ***имении Лужесно*** Витебского уезда сгорели принадлежавшие Купцу Попову, мельница с находившимся в ней хлебом и сукновальней. Убыток оценен в 35000 рублей" [12].

"В 1896 г. в Витебской губернии окончательно обеспечены постройками причты Коратаевский, Кобылинский, Казановской, Язис-Пятницкой, Апанасковичской, Добрыгорской, Липинишской и ***Лужеснянской*** церквей" [13]. У "Обзоре за 1907 год" можна пачэрпнуць інфармацыю пра тое, што "... проводились но не окончены работы по возведению в ***Лужесно*** на 10 000 рублей казенных денег и до 6000 рублей местных средств.".

* "... при ***Лужеснянском с.-х. училище*** – курсы по садоводству и огородничеству ..." [14]. У "Отчете Витебской губернской Управы по делам земского хозяйства за 1909 г." распавядаецца пра тое, што ў пры лужаснянскім земляробчым гуртку была праведзена



Репозиторий ВГУ

сельска-гаспадарчая выстава: “Были устроены с.-х. выставки при следующих земледельческих кружках Жолнеровском, Веляшковичском, Юдинском, Поддубьевском, Верховском, ***Лужеснянском*** и Храповичском Витебского уезда” [15]. Тут жа змяшчаецца цікавая інфармацыя пра тое, што на ферму Лужасна быў перададзены племянны англійскі бычок: “На получение от Главного Управления Землеустройства и Земледелия по Департаменту Государственных земельных имуществ безвозвратное пособие (3600 руб.) на покупку 18 племенных бычков. Было приобретено 22 бычка ангельской породы”. У Віцебскім уездзе бычкоў атрымалі земляробчыя гурткі ў вв. Цвяткоўшчына, Сенькава, Сакольцкі-Вымнянскія, Косава, Паддуб’ева і ферма ***Лужасна.***

Важная статыстычная інфармацыя змяшчаецца ў кнізе “Список населенных мест Витебской губернии” [16]. У ім па 5 катэгорыях прыводзяцца ўзвесткі пра: назву паселішча, каму належала, ці у склад якога таварыства сельскіх гаспадароў уваходзіла; колькасць дзесяцін зямлі; колькасць жыхароў; да якога прыходу адносіўся. У Мішкаўскай вобласці знаходзілася два населеных пункта – пагост Лужасна і маёнтак Лужасна.

| Название нас. Места | Кому принадлежит из земледельцев или какому сельскому обществу | Количество земли в десятинах | Число жителей | Какого прихода |
|---|---|---|---|---|
| ***Пог. Лужесно*** | Причту Лужеснянской церкви | 38 десятин удобной,<br>18 десятин под лесом | 3 двора<br>4 мужчины<br>5 женщин | Лужеснянского православного |
| ***Им. Лужесно*** | Обществу Витеб. сельских хозяев | 43 удобной<br>48 неудобной<br>15 под лесом | 1 двор<br>4 мужчины<br>3 женщины | в г. Витебске |

Цікавымі можа паказацца і інфармацыя прыродазнаўчага характару. Напрыклад “Сведения о вскрытии и замерзании судоходных, сплавочных рек, озер и каналов Витебской губернии за десятилетие с 1856-1866 гг.”. У іх ліку і Лужаснянкі [17].

У зборніку артыкулаў “Віцебшчына” можна даведацца, што Лужасна (разам з в. Каралева і Фатынь) была метэаралагічная станцыя [18]. У ёй жа Лужасна прыгадваецца сярод найбольш жывапісных куткоў наваколляў Віцебска “***Лужаснянская сельска-гаспадарчая школа***, Мядвежыя горы, Слабодка, сасоннік, хутары па правым беразе Дзвіны” [19].

Звесткі, якія прыводзяцца ў крыніцах могуць быць карысныя і ў нашы дні. У засакрэчанай брашуры “Асноўныя пытанні вапнавання глебы па Віцебшчыне і Полаччыне” выдадзенай у 1930 г. прыводзіцца неабходная колькасць вапны для вапнавання зямлі ў вучэбнай ферме Лужасна: 3,8 тон вугля-кіслай вапны на гектар” [20].

Такім чынам, кароткія, статыстычныя звесткі, якія змяшчаюцца ў памятных кніжках змяшчаюць каштоўнейшую інфармацыю, якая можа быць выкарыстана пры напісанні гісторыі населеных месцаў.


1. Памятная книжка Витебской губернии за 1864 год. – С. 344.
2. Памятная книжка Витебской губернии за 1865 год
3. Тамсама
4. Памятная книжка Витебской губернии за 1866 год. – С. 200
5. Памятная книжка Витебской губернии за 1910 год
6. Памятная книжка Витебской губернии за 1909 год
7. Гончаров В. История Первой Витебской партизанской бригады. [Электронны варыянт] // зберагаецца ў асабістым архіве аўтара
8. Памятная книжка Витебской губернии за 1878 год. – С. 260
9. Статистический отдел: Заводская и промышленная промышленность Витебской губернии // Памятная книжка Витебской губернии за 1865 год. – С. 119–130
10. Ведомость о мукомольных мельницах Витебской губернии // Памятная книжка Витебской губернии за 1865 год. – С. 302.
11. Сементовский А. О ярмарках Витебской губернии // Памятная книжка Витебской губернии за 1867 год


Репозиторий ВГУ

12. Обзор Витебской губернии за 1896 год. – С. 57
13. Обзор Витебской губернии за 1896 год. – С. 121
14. Обзор деятельности объединенной организации губернского и уездного земств и ведомства землеустройства по оказанию агрономической помощи населению Витебской губернии в 1913 г. Витебская т-литограф. П. А. Подземского. 1915.
15. Отчет Витебской губернской Управы по делам земского хозяйства за 1909 г. – С. 9
16. Список населенных мест Витебской губернии. Витебск 1906 г. – С. 32
17. Памятная книжка Витебской губернии за 1866 год.
18. Віцебшчына /пад рэдакцыей М.І. Касьпяровіча. Віцебск. 1925. – С. 179
19. Куткі жывой прыроды у Віцебску і яго ваколіцах // Віцебшчына /пад рэдакцыей М.І. Касьпяровіча. Віцебск. 1925. – С. 184.
20. Асноўныя пытанні вапнавання глебы па Віцебшчыне і Полаччыне. – Віцебск, 1930.

**Грыбко В.В.**

## ІВАНСКАЯ ГАЛІНА РОДУ ВАЛАДКОВІЧАЎ: ПОШУКІ І АДКРЫЦЦІ

У 1990 г. лёс закінуў мяне ў Чашніцкі раён у вёску Іванск, дзе я працую ў мясцовай школе ўжо 20 гадоў. Іванская зямля прыняла з сапраўднай беларускай гасціннасцю. Гэты край з яго багатым мінулым і цудоўнымі краявідамі стаў родным для мяне і маёй сям'і. Вывучыць гісторыю гэтай зямлі, далучыць да яе мясцовых вучняў, навучыць шанаваць свой край зрабілася маёй галоўнай задачай. З гэтай мэтай я стварыў у 1995 г. гісторыка-краязнаўчы гурток “Спадчына”. На яго занятках, а таксама ў паходах і падарожжах вучні пазнавалі гісторыю сваёй роднай зямлі. Разам з тым збіраўся, назапашваўся і апрацоўваўся багаты матэрыял, які дазволіў мне ў 2000 г. апублікаваць гістарычна-краязнаўчы нарыс “Іванск”. Але з цягам часу ўдалося знайсці новыя цікавыя факты, фотаздымкі, сабраць успаміны, правесці новыя даследаванні, якія ўзбагацілі веды па гісторыі Іванска і ваколіц і дазволілі падрыхтаваць другое, значна дапоўненае выданне гісторыка-краязнаўчага нарыса “Іванск”, якое неўзабаве пабачыць свет.

Адна з частак нарыса прысвечана гісторыі незаслужана забытага роду Валадковічаў, які ўнёс значны ўклад у сацыяльна-эканамічнае і культурнае развіццё Чашніччыны. Пры вывучэнні гісторыі гэтага роду я карыстаўся шматлікімі даступнымі мне гістарычнымі крыніцамі. Гэта, перш за ўсё, “Акты Віленскай Археаграфічнай камісіі”, якія ўяўляюць сабой звыш трох дзясяткаў тамоў розных дакументаў (заявы, судовыя рашэнні, прывілеі, наданні і г.д) з гісторыі нашай краіны, апрацаваных і падрыхтаваных да друку гэтай камісіяй у другой палове XIX – пач. XX ст. Кожны том змяшчае геаграфічны і імянны даведнік, з указаннем нумара дакумента і старонкі, што значна спрашчае пошук патрэбных прозвішчаў і населеных пунктаў. Прагледзеўшы гэтыя тамы, мне ўдалося знайсці змястоўную інфармацыю пра прадстаўнікоў роду Валадковічаў з XV і да XIX ст. Другой важнай крыніцай, якая дазволіла мне знайсці дадатковыя звесткі пра род Валадковічаў у другой палове XIX – пачатку XX ст. з'яўляюцца Памятныя кнігі Віцебскай губерніі, якія змяшчаюць багаты і разнастайны статыстычны матэрыял па многіх аспектах жыцця губерніі ў той час.

Цікавую інфармацыю пра розных прадстаўнікоў роду Валадковічаў я знайшоў у кнігах польскіх аўтараў Пулаўскага [1], Жыхлінскага [2]. Але найбольш важнай крыніцай звестак пра род Валадковічаў з'яўляецца праца аднаго з прадстаўнікоў роду Валадковічаў Анджэя [3], бо ў ёй сабраны вялікі матэрыял пра амаль усіх прадстаўнікоў Іванскай галіны роду Валадковічаў і складзена яго генеалогія. На жаль, гэтая крыніца не апублікавана і ёсць толькі ў машынапісным варыянце, які мне пашчасціла здабыць.

Апісанне іванскага маёнтка Валадковічаў мне ўдалося знайсці і ў Слоўніку геаграфічным каралеўства Польскага [4]. Падрабязна апісваецца палацавы комплекс і маёнтак Валадковічаў у даследаванні польскага гісторыка Рамана Афтаназі [5]. Дадатковай крыніцай па вывучэнні палацава-паркавага ансамбля Валадковічаў у Іванску з'явілія ўспаміны старажылаў вёскі, якія памяталі яшчэ неразбураны палац і шматлікія гаспадарчыя памяшканні і дзякуючы якім ўдалося зрабіць рэканструкцыю маёнтка.